# Акцэнты нацыянальнай памяці



**Рэспубліканскі семінар па пытаннях гістарычнай палітыкі і музейнай справы адбыўся ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. У рамках мерапрыемства ўдзельнікі абмеркавалі адлюстраванне гістарычных перыядаў у музейных экспазіцыях, асвятленне падзей часоў нацысцкай акупацыі, выкананне заканадаўства ў галіне музейнай справы, а таксама працоўныя пытанні і поспехі сферы па выніках 2022 і пачатку 2023 года.**

Як адзначыла начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Ірына Карповіч, музейная сфера можа пахваліцца пэўнымі дасягненнямі і добрымі вынікамі працы як у 2022-м, так і ў першай палове 2023 года. Тым не менш існуе шэраг праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць пасля праверак розных ведамстваў, — у тым ліку наконт зместу экспазіцый, падачы матэрыялаў, напаўнення музейных сувенірных лавак, узбагачэння іх асартыменту. Асаблівую ўвагу неабходна надаць наяўнасці сярод сувенірнай прадукцыі вырабаў з дзяржаўнай сімволікай.

Не лішне таксама нагадаць, што ў пастаяннай экспазіцыі музеяў мусяць быць створаны раздзелы, прысвечаныя развіццю Рэспублікі Беларусь і яе дасягненням на сучасным этапе з акцэнтам на ролі мясцовых ураджэнцаў і жыхароў таго ці іншага раёна. Ірына Карповіч падкрэсліла, што музейная справа сёння з'яўляецца перадавым стратэгічным напрамкам у сферы культуры, своеасаблівым флагманам гістарычнай палітыкі дзяржавы.

## ЭТАПЫ СТАНАЎЛЕННЯ

Генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін выступіў з дакладам аб асаблівасцях дзяржаўнай гістарычнай палітыкі на сучасным этапе, зрабіўшы таксама пэўны экскурс у гісторыю яе змен і станаўлення ў ранейшыя перыяды айчыннай мінуўшчыны. Як адзначыў Вадзім Францавіч, савецкая канцэпцыя гісторыі мела некалькі этапаў фарміравання — ад пралетарскага рэвалюцыянарызму і сталінскага дагматызму 1920—1950-х гадоў да росквіту савецкай гістарычнай навукі 1960—1980-х гадоў.

Паводле Вадзіма Гігіна, з атрыманнем Рэспублікай Беларусь незалежнасці пачалася пэўная рэвізія савецкай гістарычнай палітыкі, але гэты працэс быў спынены ў 1994 годзе пасля перамогі на першых у краіне выбарах Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, які ў галіне гістарычнай палітыкі зрабіў стаўку на сакралізацыю памяці аб Вялікай Айчыннай вайне. У 2003 годзе пакладзены пачатак дзяржаўнай ідэалагічнай палітыкі, створаны адпаведны курс для вышэйшых навучальных устаноў.

Тым не менш, як падкрэсліў выступоўца, гэты перыяд характарызуецца адсутнасцю самой выпрацаванай канцэпцыі дзяржаўнай ідэалогіі, што пазней неаднаразова адзначалася. Рабіліся спробы спалучэння пэўных элементаў ідэалогій марксізму-ленінізму, лібералізму, кансерватызму і сацыял-дэмакратыі. Далейшы рух у гэтым кірунку прывёў да таго, што дзяржава ў пэўнай ступені страціла кантроль над гістарычнай палітыкай.

## ГІСТОРЫЯ ПЫТАННЯ...

Увосень 2020 года, цягам дыялогавых пляцовак з грамадзянамі, пачало ўзнікаць разуменне, што наспеў час надаць гістарычнай палітыцы больш увагі. Першыя крокі ў гэтым напрамку — абвяшчэнне 2021-га Годам народнага адзінства і ўстанаўленне Дня народнага адзінства, які адзначаецца 17 верасня, калі ў 1939 годзе Заходнюю Беларусь далучылі да БССР. Як паведаміў Вадзім Гігін, такім чынам было выканана рашэнне Народнага Сходу Заходняй Беларусі аб абвяшчэнні гэтага дня святочным, прынятае яшчэ ў кастрычніку 1939-га.

З пачатку 2022-га, аб'яўленага Годам гістарычнай памяці, стартавала правядзенне сістэмнай гістарычнай палітыкі: 6 студзеня прайшла нарада ў Прэзідэнта, на якой былі расстаўлены асноўныя акцэнты па перыядах гісторыі Беларусі. 4 лютага Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне аб стварэнні Савета па гістарычнай палітыцы на чале з кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта.

Сярод кампетэнцый гэтага органа — выпрацоўка асноўных падыходаў да трактоўкі тых ці іншых гістарычных перыядаў, вызначэнне дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да помнікаў, тапанімікі, вучэбнай літаратуры, навуковых даследаванняў па гісторыі. Прапаноўвалася таксама стварыць Інстытут нацыянальнай памяці на ўзор устаноў, якія існуюць у некаторых суседніх дзяржавах, — але ад ідэі адмовіліся на карысць калегіяльнага органа, дзякуючы якому могуць адбывацца дыскусіі і выпрацоўвaецца агульнае рашэнне.



Музейная экспазіцыя ў мемарыяльным комплексе "Хатынь"

## ...І ПЫТАННІ ДА ГІСТОРЫІ

Звяртаючыся да асноўных праблем айчыннай гістарычнай палітыкі, Вадзім Гігін са спасылкамі на даследаванні і дасягненні нашай сучаснай гістарыяграфіі распавёў удзельнікам семінара аб такіх важных з'явах, перыядах і эпізодах беларускай мінуўшчыны, як часы Полацкага і Тураўскага княстваў, аб міфалогіі, што доўгі час існавала вакол бітвы пад Оршай 8 верасня 1514 года, аб рэальнай ролі шляхты ў гісторыі нашай краіны і палітыцы паланізацыі, якая праводзілася пасля ўключэння беларускіх зямель у склад Рэчы Паспалітай у 1569 годзе.

Гаворачы аб такой трагічнай старонцы айчыннага мінулага, як сталінскія рэпрэсіі, Вадзім Гігін падкрэсліў, што адмаўленне рэальнасці гэтай з'явы непрымальнае, але неабходна адэкватна ацэньваць яе маштаб і не дапускаць яго фальсіфікацыі. Што тычыцца падзей перыяду гітлераўскай акупацыі Беларусі, пры іх ацэнцы відавочнае адназначна негатыўнае стаўленне да калабарацыяністаў, якія заплямілі сябе супрацоўніцтвам з нацыстамі.

## КОМПЛЕКСНЫ ПАДЫХОД

Таксама на семінары выступіў кіраўнік следчай групы па расследаванні крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь Валерый Талкачоў. Ён распавёў аб сумеснай рабоце з музеямі, якім перадаюцца рэчавыя доказы з раскопак на месцах пахавання ахвяр нацысцкіх злачынстваў. Напрыклад, цяпер напаўняецца экспазіцыя мемарыяльнага комплексу "Трасцянец".

Напрыканцы мерапрыемства прайшоў закрыты паказ фільма "На іншым беразе", які распавядае пра Заходнюю Беларусь у 1920-я гады. Прэм'ера стужкі запланавана на верасень і будзе прымеркавана да Дня народнага адзінства, але карціну з улікам яе тэматыкі прапанавалі ўвазе ўдзельнікаў сустрэчы ўжо цяпер. Рэспубліканскі семінар прадэманстраваў, што фарміраванне нацыянальнай гістарычнай палітыкі магчымае толькі пры плённым супрацоўніцтве музейных работнікаў, экскурсаводаў, кінематаграфістаў — а зрэшты, і ўсяго грамадства.

**Антон РУДАК**



Выданні, прысвечаныя нацысцкім злачынствам у Беларусі



Мемарыяльны комплекс "Хатынь". Адна з зал